УДК 821.161.3-1*Я.Янішчыц

**С. П. Каралькова**
*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны», Гомель*

# СПЕЦЫФІКА МАСТАЦКАГА МЫСЛЕННЯ Я. ЯНІШЧЫЦ

**Уводзіны.** Мастацкае мысленне — від духоўнай дзейнасці і разумовай работы творцы, якое накіравана на стварэнне мастацкай прадукцыі. Мастацкае мысленне імкнецца сфарміраваць мастацкія вобразы не толькі ў свядомасці аўтара, але і ў свядомасці чытача, узаемадзейнічае з іншымі формамі мастацкай свядомасці і дзейнічае на ўсіх стадыях творчага працэсу.

У артыкуле аналізуецца адметнасць мастацкага мыслення Я. Янішчыц. Актуальнасць абранай тэмы бачыцца ў неабходнасці далейшага сістэмнага вывучэння паэзіі Я. Янішчыц.

«Паэзія (грэч. poesis творчасць) — адзін з асноўных відаў мастацтва слова, эмацыянальна-вобразная вершаваная творчасць. Для паэзіі характэрны перш за ўсё павышаная эмацыянальнасць, ужыванне разнастайных сінтаксічных фігур, тропаў, музычны пачатак. Так, І. Гердэр назваў паэзію «музыкай душы» [1, с. 11].

Беларуская жаночая паэзія займае асаблівае месца ў сучаснай беларускай культуры. У XX стагоддзі жанчыны здабылі поўны паэтычны голас. Яскравым прадстаўніком беларускай жаночай паэзіі стала Я. Янішчыц. Дзякуючы яе творчасці, беларуская літаратура атрымала новы віток развіцця.

**Асноўная частка.** Яўгенія Янішчыц пачала сваю літаратурную дзейнасць у 1970-я гады. Яна выступіла ў друку разам з такімі творцамі, як Р. Баравікова, Т. Бондар, В. Гардзей, Ю. Голуб, С. Законнікаў, В. Коўтун, Н. Мацяш, У. Някляеў, А. Разанаў, А. Салтук і інш. «Час “адлігі”, які наступіў пасля XX з’езда КПСС, быў спрыяльны для творчага станаўлення і раскрыцця мастакоўскага патэнцыялу, атмасфера свабоды адкрывала новыя магчымасці. Беларуская паэзія знаходзілася ў тую пару на пераходзе да новай сваёй якасці — ломкі схематычных перашкод і дагматычных рэкамендацый, смелага выхаду ў жыццё, свабоднага выяўлення жыццёвай разнастайнасці, пачуццёвай і мастацкай шматграннасці» [2, с. 6]. Менавіта «адліга» вымагала ад пісьменнікаў іншых падыходаў да творчасці, адлюстравання рэчаіснасці. Літаратура патрабавала ад маладога пакалення пісьменнікаў новых дасягненеў. «Неабходна было шукаць больш шырокія пазнавальна-эстэтычныя магчымасці ў раскрыцці традыцыйных тэм, новы матэрыял, абумоўлены сучаснасцю і абставінамі развіцця літаратурнага працэсу. Усе пералічаныя тэндэнцыі адлюстраваліся ў творчасці Я. Янішчыц», — мяркуе С. Калядка [2, с. 6].

Каб правільна і поўна зразумець, што ўключае ў сябе літаратурны працэс, трэба разумець, што такое «творчая індывідуальнасць», якую эвалюцыю яна прайшла. Гэта адна з галоўных праблем тэорыі літаратуры. Таму ў многіх навукоўцаў пры яе даследаванні ўзнікаюць цяжкасці. Трэба памятаць, што мастацкая індывідуальнасць уяўляе своеасаблівую сістэму, якая ўключае ў сябе розныя кампаненты, што ў выніку прыводзіць да стварэння своеасаблівага «індывідуальнага стылю». «Індывідуальнасць — сукупнасць характэрных, адметных рыс, якія вылучаюць якую-небудзь асобу або з’яву, мастацкую індывідуальнасць паэта, індывідуальнасць стылю пісьменіка», — мяркуе В. Рагойша [1, с. 98].

Паэтычная спадчына Я. Янішчыц — адна з самых яскравых і адметных старонак не толькі жаночай паэзіі, але і ўсёй беларускай літаратуры. Ужо самым першым вершам паэткі ўласціва адкрытасць, эмацыянальнасць
і юнацкі максімалізм:

Хачу я ў царства нейкае чароўнае
Маленькаю жар-птушкай заляцець,
Дзе лебедзі ўзнімаюцца чародамі,
Каб хмаркамі ў небе белякцець... [3, с. 24].

Але з цягам часу паэтка пачынае сталець, пазнаваць сябе і свет, шырокі і неаднастайны. Час вымагаў узняцца на новы ўзровень адказнасці, глыбей адчуць жыццё, яго ўнутраны сэнс. Менавіта ў гэты перыяд адбываецца змена эмацыянальнай і лірычнай раскаванасці, прасторавасці адчуванняў, юнацкай захопленасці жыццём, і ў паэзію Я. Янішчыц прыходзіць сталы роздум і філасофская разважлівасць. З’ўляецца сацыяльная насычанасць думак і вобразаў:

Боль перасіліўнемату,
І яркіхфарбаў мне не шкода,
Бо і сама я, як прырода,
То ападаю, то цвіту [3, с. 22].

Вершы Я. Янішчыц — гэта адлюстраванне існасці, свайго ўнутранага «Я». Палессе для паэтэсы — гэта не толькі месца нараджэння і фарміравання як асобы, але і яе ўнутраны свет, яе кавалачак зямлі, прасякнуты ўспамінамі, любоўю, марамі і верай у светлую будучыню.

© Каралькова С. П., 2017



Репозиторий БарГУ

Усеабдымная любоў да бацькоўскай зямлі, роднай вёскі стала сутнасцю творчасці паэткі. Маленькую радзіму паэтэса заўсёды называе пяшчотна: край «калінавы, шыпшынны» [4, с. 33], «вясновая, вясковая зямля» [5, с. 11], «радзіма лугавая» [5, с. 9], «край мой ціхі» [5, с. 14], «белабярозавы кут» [4, с. 68], «роднае палескае сяло» [5, с. 61]. Гэтымі словамі перадаецца прыгажосць, непаўторнасць, адметнасць палескай зямлі, зачараванасць ёю, адчуванне велічы і каштоўнасці.

Янішчыц на працягу ўсёй сваёй творчасці паэтызуе родны край, прыроду, чуйнасць да хараства навакольнага свету. Яна імкнецца да спасціжэння таямніц быцця і ўласнага існавання. Высокая маральная акрэсленасць жыццёвых пазіцый і поглядаў, шчырая адкрытасць сардэчных спавяданняў — гэта тыя кірункі творчай індывідуальнасці Я. Янішчыц, якія характарызуюць лірычна-псіхалагічны свет паэткі.

Інтымная лірыка Я. Янішчыц — неадназначная з'ява. Пачуцці, настроі выяўляюцца глыбока, не толькі ўзнёсла-ўзвышана, як заўсёды адбываецца ў сапраўдным каханні, але і зменліва-супярэчліва, паказваецца тое балючае, нераздзеленае, няспраўджанае, падманутае, здраджанае — усё тое, што ёсць у каханні. Таму яе інтымная лірыка такая ўзнёслая, шчырая, сапраўдная. Янішчыц хоча падзяліцца з чытачом не толькі горкім вопытам і горыччу расстання, але і самымі інтымнымі і сапраўднымі пачуццямі, якія яе акрыляюць:

Ты пакліч мяне. Пазаві.
Там заблудзімся ў хмельных травах.
Пачынаецца ўсё з любві,
Нават самая простая ява [3, с. 18].

Яўгенія Янішчыц сваёй лірыкай імкнулася разабрацца і ў сваім жыцці, аб чым сведчаць эпітэты, вобразы і сімвалы, якімі яна карыстаецца. Аўтарка параўноўвае сваю лірычную гераіню з бярозай. Гэта дрэва сімвалізуе пластычнасць і стойкасць, але і адзіноту:

Над самым судным днём
І над жыццёвай прозай
Панікну Палыном
І выстаю — Бярозай [3, с. 93].

Лірычная гераіня Я. Янішчыц часта адчувае сябе сіратой, яе не разумеюць і не прымаюць людзі. Пасля ўсялякіх намаганняў спадабацца навакольнаму свету гераіня выбірае адзіноту:

Буду мудра і светла маўчаць,
Як бярозка між чыстага поля [3, с. 54].

Таксама паэтка параўноўвае сваю лірычную гераіню з калінай. Нягледзячы на сваю прыгажосць і прывабнасць, каліна мае горкія плады, якія даспадобы не ўсім. Іншы раз асновай параўнання становіцца рабіна.

**Заключэнне.** Творы Я. Янішчыц прываблiваюць жыццялюбствам, натуральнасцю, непаўторнай паэтычнай інтанацыяй і стылем. Яе творчасць — яркая з'ява ў беларускай паэзіі. Непаўторная асацыятыўнасць і метафарычнасць, здольнасць мысліць арыгінальнымі вобразамі дапамагаюць узмацніць выразнасць і вобразнасць паэтычнага слова Я. Янішчыц.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. *Рагойша, В. П.* Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці: для школьнікаў і абітурыентаў / В. П. Рагойша. — Мінск : Беларус. асвета, 2009. — 303 с.
2. *Калядка, С. У.* Непрыручаная птушка Палесся. Творчая індывідуальнасць Яўгеніі Янішчыц / С. Калядка. — Мінск : Беларус. навука, 2007. — 216 с.
3. *Янішчыц, Я.* Пачынаецца ўсе з любві... / Я. Янішчыц. — Мінск : Маст. літ., 2008. — 334 с.
4. *Янішчыц, Я.* Каліна зімы : кн. лірыкі / Я. Янішчыц. — Мінск : Маст. літ., 1987. — 206 с.
5. *Янішчыц, Я.* На беразе пляча : лірыка / Я. Янішчыц. — Мінск : Маст. літ., 1980. — 96 с.




Репозиторий БарГУ